# ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ «ЗОРНЫ ПАХОД ПА МЕСЦАХ БАЯВОЙ СЛАВЫ»

***Аўтары:*** *творчая група навучэнцаў дзяржаўнай установы адукацыі “Вучэбна-педагагічны комплекс Пасецкі дзіцячы сад – сярэдняя школа”.*

***Кіраўнік:*** *Давыдава Зоя Валянцінаўна, намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці.*

**Мэта экскурсіі**: садзейнічаць выхаванню (абуджэнню) цікавасці да гістарычнай спадчыны малой радзімы, выхаванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці і патрыятызму, павагі да беларускай гісторыі.

**Задачы экскурсіі:**

пазнаёміць удзельнікаў экскурсіі з гістарычнымі помнікамі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне;

фарміраваць каштоўнасныя арыентыры, гонар і павагу за гістарычнае мінулае беларускага народа;

прыцягнуць увагу да гісторыі і выклікаць цікавасць да яе вывучэння;

выхоўваць беражлівыя адносіны да аб’ектаў гісторыі;

папулярызаваць дзейнасць школьнага Музея баявой Славы.

**Тып экскурсіі:** тэматычная (гісторыка-краязнаўчая).

**Від экскурсіі:** пешаходна-аўтобусная

**Маршрут экскурсіі:** г. Старыя Дарогі – в. Рубежы – Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 121-й стралковай дывізіі – аг. Сінягова – в. Гасціно – в. Рухава – аг. Пасека – в. Рубежы – г. Старыя Дарогі.

Працягласць экскурсіі: 5 гадзін.

Працягласць маршрута: 66 км.

**Змест экскурсіі:** экскурсія знаёміць з гістарычнымі помнікамі і мясцінамі Пасецкага сельскага Савета Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, якія звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны; з падзеямі ваеннай гісторыі, якія праходзілі на тэрыторыі Пасецкага сельскага Савета.

**Уступ да экскурсіі:** уступ да экскурсіі даваць пасля пасадкі групы ў аўтобус.

У арганізацыйнай частцы пасля знаёмства з групай назваць сваё прозвішча, імя, імя па бацьку; агаварыць неабходныя арганізацыйныя пытанні; нагадаць правілы паводзін ў аўтобусе, на прыпынках, пры ўваходзе ў аўтобус, выхадзе з яго, правілах бяспекі ў час экскурсіі; даць кароткае паведамленне аб тэме экскурсіі, згадаць 2-3 найбольш цікавыя

аб’екты, не даючы іх падробную характарыстыку; назваць месца пачатку экскурсіі.

Маршрут разлічаны на шырокую мэтавую аўдыторыю: дзяцей, моладзь, дарослых.

ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ
«ЗОРНЫ ПАХОД ПА МЕСЦАХ БАЯВОЙ СЛАВЫ»

| Маршрут экскурсіі | Месца прыпынкаў | Аб'ект паказу | Час | Асноўны змест экскурсіі. Пералік падтэмаў і пытанняў | Арганізацыйныя і метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|
| Пачатак экскурсіі | | | 5хвілін | Уводзіны да тэмы экскурсіі. Дадаткова можна выкарыстаць верш мясцовага паэта А.Усені «Насілкі» | Усталяваць эмацыянальна-псіхалагічны кантакт з групай. Агучыць тэму экскурсіі, яе маршрут і працягласць, месца і час заканчэння. |
| г. Старыя Дарогі – в.Рубежы | Без прыпынку | | 20хвілін | Пасецкі сельскі Савет сёння.<br>Старадарожчы-на ў час Вялікай Айчыннай вайны.<br>Пасецкі сельскі Савет ў час Вялікай Айчыннай вайны | Расказ вядзецца падчас экскурсіі. Даць даведачную інфармацыю аб населеных пунк-тах Пасецкага сельскага Савета.<br>Даць кароткую даведку аб стратах на Старадарожчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, колькасці помні-каў і абеліскаў (менавіта на тэрыторыі Пасец-кага сельскага Савета).<br>Колькасць і складанасць матэ-рыялу вар'іраваць адносна ўдзельнікаў |
| в.Рубежы | Прыпынак ля мясцовых могілак | Брацкая магіла савецкіх воінаў | 5хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнік | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помніка.<br>Даць кароткую даведку аб вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |
| в.Рубежы – м. к. у гонар воінаў 121-й стралко-вай дывізіі | Без прыпынку | | 30хвілін | Ідэя і гісторыя стварэння мемарыяльнага комплексу | Расказ вядзецца падчас руху.<br>Пры выездзе з в. Рубежы звярнуць увагу на указальнік дарогі на Мемарыяльны |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | комплекс, які ўяўляе сабой помнік у выглядзе зоркі |
| Мемары-яльны комплекс у гонар воінаў 121-й стралко-вай дывізіі | Прыпынак | Штабная зямлянка, часавы са станкавым кулямётам «Максім», лясны калодзеж з пітной вадой, гармата, скульптурная кампазіцыя жанчыны з падлеткам, абеліск | 30хвілін | Апісанне аб’ектаў Мемарыяльнага комплексу. Расказаць пра дзейнасць воінаў дывізіі. | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да аб’ектаў комплексу. Гістарычныя падзеі распавядаць у храналагічным парадку. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыёмы лакалізацыі, зрокавай рэканструкцыі, апісання, расказа. Пажадана даць час для самастойнага агляду і фатаграфавання |
| аг. Сінягова | Прыпынак ля мясцовых могілак | Брацкія магілы савецкіх воінаў | 10хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнікі | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помнікаў. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыёмы апісання, расказа |
| | | Брацкія магілы партызан | 10хвілін | | |
| | | Магіла Петрушэні Івана Сцяпанавіча | 5хвілін | | |
| | Прыпынак на ўскраіне вёскі | Помнік савецкім воінам і землякам | 10хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнік. Даць апісанне скульптурнай групы. | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помніка. Звярнуць увагу на беражлівыя адносіны да помнікаў. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | (земляны курган) | | | |
| аг. Сінягова-<br>в. Гасціно | Без прыпынку | | 10хвілін | Мінулае і сучаснае в.Сінягова і в. Гасціно | Расказ вядзецца падчас руху. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыём расказа |
| в. Гасціно | Прыпынак ля мясцовых могілак | Брацкая магіла савецкіх воінаў | 5хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнікі | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помнікаў. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыёмы апісання, расказа<br>Можна выбраць найбольш цікавыя звесткі з біяграфіі героя, выкарыстаць фотаздымкі.<br>Расказаць аб яго сустрэчы з легендарным дзедам Талашом на прыёме ў Крамлі |
| | | Брацкая магіла партызан і ахвяр фашызму | 5хвілін | | |
| | | Магіла Мікіты Шэшкі – Сінягоўскага дзеда Талаша (помнік) | 10хвілін | Расказ пра М.Шэшку | |
| в. Гасціно –<br>в. Рухава | Без пры-пынку | | 25хвілін | З гісторыі населенага пункта в.Рухава. Мінулае і сучаснае. | Расказ вядзецца падчас руху. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыём расказа |
| в. Рухава | Прыпынак ля мясцовых могілак | Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан | 5хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнікі. | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помнікаў.<br>Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыёмы апісання, расказа<br>Засяродзіць увагу на подзвігу камсамолкі М.Русаковіч |
| | | Магіла Русаковіч Марыі | 5хвілін | | |
| | | Магіла | 5хвілін | Даць інфармацыю пра воіна-афганца Русаковіча А.Д. | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Русаковіча А.Д. | | | |
| | Прыпынак ля магазіна | Помнік у гонар 5-га партызанскага атрада імя С.М.Будзёнага | 5хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнік | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помніка. Звярнуць увагу, што ў вёсцы ў 1943-44 гг. размяшчаўся 5-ы партызанскі атрад імя С.М.Будзёнага 100-й брыгады імя С.М.Кірава |
| в. Рухава – аг.Пасека | Без прыпынку | | 10 мін | Мінулае і сучаснае аг. Пасека. | Расказ вядзецца падчас руху. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыём расказа |
| аг.Пасека | Прыпынак ля будынка сельскага савета | Мемарыяльная дошка на будынку Пасецкага сельскага Савета | 5хвілін | Даць кароткую гістарычную даведку пра дзейнасць воінаў 100-й партызанскай брыгады імя С.М.Кірава | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да будынка. Рэкамендуецца прачытаць інфармацыю на дошцы. |
| | Прыпынак ля мясцовых могілак | Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан | 5хвілін | Гістарычныя звесткі пра помнікі | Група выходзіць з аўтобуса, падыходзіць да помнікаў. Рэкамендуецца выкарыстоўваць прыёмы апісання, расказа |
| | | Магіла Украінскага І.К., героя грамадзянскай вайны | 5хвілін | | |
| | | Магіла Нікіціна-Лапіцкага І. Дз., героя | 5хвілін | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | грамадзянскай вайны | | | |
| | Прыпынак ля Цэнтра вольнага часу і адпачынку | Школьны музей Баявой Славы | 15хвілін | Абзорная экскурсія. Праводзяць навучэнцы ўстановы адукацыі | Група выходзіць з аўтобуса, уваходзіць у будынак. Задача экскурсавода – падрыхтаваць групу да агляду экспазіцыі.<br>Выкарыстоўваць прыёмы экскур-сійнай даведкі |
| аг.Пасека –<br>г. Старыя Дарогі | Без пры-пынку | | 25хвілін | Заключнае слова аб гістарычнай ролі помнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў выхаванні падрастаючага пакалення. | Падвесці вынікі экскурсіі, адказаць на пытанні группы, падзякаваць за ўвагу |





Фота 1-2. Мемарыяльны комплекс у гонар воінаў 121-й стралковай дывізіі



Фота 3. Мемарыяльны комплекс
у гонар воінаў 121-й стралковай дывізіі



Фота 4. Помнік савецкім воінам і землякам, аг. Сінягова



Фота 5. Магіла Русаковіча А., в. Рухава



Фота 6. Музей Баявой Славы, аг. Пасека